Змест

Глава 1. Водгук як жанр мастацкай ворчасці

*1.1.* Паняцце пра водгук 5

*1.2.* Прыкладная схема аналізу літаратурнага твора 6

*1.3.* Формы напісання водгуку 9

*1.4.* Тыповыя памылкі 10

Глава *2.* Методыка напісання водгуку на мастацкі твор

*2.1.* Метадычная схема да напісання водгуку 13

*2.2.* Сродкі перадачы экспрэсіі 13

*2.3.* Як пісаць водгук (паслядоўнасць) 14

*2.4.* Прыкладныя варыянты элементаў структурна-кампазіцыйных частак водгуку на паэтычна твор 16

*2.5.* Клішэ для ўвядзення літаратуразнаўчых тэрмінаў і лінгвістычных паняццяў 17

Заключная частка 19

Дадаткі да работы

*№1.Занятак па тэме "Мастацкія сродкі ў літаратурных творах, іх роля"* 21

*№2. Занятак па тэме "Афарызмы"* 24

*№3. Верш Пімена Панчанкі "Жаданні" і водгук на яго* 28

*№4. Тэкст для водгуку "Птушкі" Янкі Сіпакова і водгук на яго* 31

Спіс выкарыстаных крыніц 35

# ГЛАВА 1. Водгук як жанр мастацкай творчасці

## 1.1. Паняцце пра водгук

Водгук – жанр мастацкай творчасці, для якога характэрна суб'ектыўнасць у аналізе і ацэнцы зместу твора.

Водгук для алімпіяды крыху адрозніваецца ад звычайнага водгуку тым, што тут уключаюцца элементы літаратуразнаўчага і лінгвістычнага аналізу. Варта таксама захаваць і жанравую цэласнасць, эмацыянальнасць, экспрэсіўнасць, вобразнасць. Сваё меркаванне, ацэнка павінны быць абавязкова абгрунтаванымі. Водгук адлюстроўвае эмацыянальна-ацэначныя адносіны, меркаванні, уражанні аб творы.

Водгук на мастацкі твор вучні пішуць як на ўроках беларускай і рускай літаратуры, так і на ўроках мовы.

Водгукі павінны быць выключна самастойнымі, таму што тэкст можа стварыць неаднолькавае ўражанне ў розных людзей. Той, хто піша водгук, мае магчымасць паразважаць на ўзнятую аўтарам тэму.

Звычайна для водгукаў прапануецца невялікі твор. Вучыць пісаць водгук найлепш па паэтычным творы публіцыстычнага гучання. Там больш выразная аўтарская пазіцыя, шмат моўных сродкаў. У вершах мастацкія сродкі вучні заўважаюць хутчэй, чым у празаічным творы.

*Жанравая спецыфіка водгуку*

Жанравыя прыметы: разгорнутае асобаснае выказванне аб мастацкім творы; публіцыстычнасць, эмацыянальна-ацэначны тып тэксту.

Задача: перадаць уражанне ад мастацкага твора.

Асаблівасці падыходу: аўтар водгуку знаёміць са сваім інтэлектуальна-эмацыянальным ўспрыманнем твора; сістэма аргументацыі заснавана на асабістым чытацкім вопыце, гусце і прыхільнасцях.

Кампазіцыя: свабодная (уражанні з абгрунтаваннем), разважанне, якое аргументуе выказаную ацэнку.

Мова: эмацыянальна афарбаваная лексіка з выкарыстаннем вобразна-выяўленчых сродкаў мовы.

Такім чынам, мэта водгуку – падзяліцца ўражаннямі ад прачытанага твора літаратуры. Суб'ектыўны падыход у выбары зместу водгуку раскрывае не істотныя бакі мастацкага твора, а асобу таго, хто піша водгук. З водгуку мы даведваемся аб жыццёвай пазіцыі аўтара, яго асобасных якасцях, адносінах да тых ці іншых бакоў жыцця, якія знайшлі ўвасабленне ў дадзеным мастацкім тэксце. Ацэнка, якая фармулюецца ў пачатку сачынення-водгуку ў выглядзе тэзіса, аргументуецца ў асноўнай частцы. Пры гэтым доказы, якія раскрываюць думкі і пачуцці аўтара водгуку, носяць эмацыянальна-ацэначны характар. Толькі пасля аб'ектыўнага аналізу можна перайсці да суб'ектыўнай ацэнкі твора.

### 1.2. Прыкладная схема аналізу лірычнага твора

1. Пачаць разгляд твора можна з прыёму "запытання".

Сутнасць прыёма заключаецца ў пастаноўцы пытанняў "прадразумення" (што ў тэксце падалося дзіўным, няясным, незразумелым?). Прачытаўшы твор, паспрабуйце ўступіць у "дыялог" з тэкстам, аформіўшы ўласнае неразуменне ў выглядзе ланцужка пытанняў.

2. Соцыякультурны, гісторыка-культурны, гісторыка-біяграфічны, філасофскі кантэкст.

Рэальна-біяграфічны і фактычны каментарый (месца і час, абставіны і падзеі з жыцця аўтара, якія садзейнічалі напісанню твора).

Да якога тыпу належыць твор:

а) з'яўляецца значна набліжаным да біяграфіі паэта;

б) уяўляе сабой чысты вымысел;

в) уяўляе сабой адзінства паэтычнага вымыслу і мастацка транфармаваных фактаў рэальнай біяграфіі паэта.

Якім чынам адлюстраваны факты біяграфіі ў тэксце:

а) ёсць прысвячэнні;

б) уключаны імёны, даты, геаграфічныя назвы;

в) ёсць аллюзіі на падзеі рэальнага жыцця, узаемаадносіны з канкрэтнымі людзьмі.

Як суадносіцца твор з творчасцю паэта ў цэлым, з агульнакультурным кантэкстам? Да якога перыяду творчасці паэта ён адносіцца? Ці ўваходзіць у пэўны цыкл (зборнік)? Ці належыць верш да пэўнага творчага метаду, накірунку, плыні. Сувязь з традыцыямі беларускай і сусветнай культуры.

“Упішыце“, па магчымасці, твор у кантэкст гістарычнага часу, літаратурнага працэсу, лёсу паэта.

3. Інтэрпрэтацыя зместу твора.

- ✓ Сэнс назвы твора.

Ці мае твор назву (або растлумачце яе адсутнасць)? Што ў ёй адлюстравана?

- ✓ Тэматыка, праблематыка, сэнсавыя матывы.

Характар тэматыкі: канкрэтна-гістарычная (сацыяльныя, часавыя, нацыянальныя параметры); вечная (псіхалагічныя параметры); спалучэнне абодвух аспектаў. Вядучая тэма, яе развіццё, іерархія падтэм.

Якія матывы ўзнікаюць і ў якіх вобразах увасабляюцца?

Як у праблематыцы праяўляецца аўтарская індывідуальнасць, самабытны аўтарскі погляд на свет?

- ✓ Мастацкі час і прастора.

Якімі словамі абазначаецца мастацкая прастора?

Як выражаны мастацкі час?

Час і прастора характарызуюцца канкрэтнасцю, абстрактнасцю, спалучэннем канкрэтнасці і абстрактнасці. Што больш значыма – мастацкі час ці прастора (аднолькава значымы)?

Ідэя, пафас (вядучы эмацыянальны фон твора), аўтарскі ідэал.

Якія інтанацыі пераважаюць – грамадскія ці асабістыя?

Якім чынам дасягаецца эмацыянальна-сэнсавая цэласнасць верша?

Сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці.

Ці ёсць знешні сюжэт? Што складае яго аснову? Як развіваецца паэтычная думка і ў які момант дасягае кульмінацыі? Якімі мастацкімі сродкамі гэта адлюстравана: з дапамогай лірычнага сюжэту, змены карцін, інтанацыі і г.д. які

вынік лірычнага выказвання? Ці знаходзіць лірычны канфлікт сваё вырашэнне? Якімі паэтычнымі сродкамі гэта выражана?

Апорныя кропкі (пункты) кампазіцыі.

Вобраз лірычнага героя, характар лірычнага перажывання.

Якім настроем прасякнуты верш? Што на першым плане – падзеі ці перажыванні лірычнага героя? Што адбываецца з лірычным героем? Які стан лірычнага героя? Чым ён выкліканы або чаму мяняецца? З дапамогай якіх мастацкіх сродкаў гэта адлюстравана?

Асноўныя вобразы верша і прыёмы іх стварэння.

Якая намалявана карціна і з дапамогай якіх мастацкіх сродкаў?

Гук, святло і колер у вершы.

Які кампазіцыйны прыём арганізуе вобразную сістэму (паўтор, узмацненне, антытэза і інш.).

4. Аналіз вобразна-выяўленчых сродкаў, вызначэнне іх ролі ў раскрыцці ідэйнага зместу твора, выяўленні аўтарскай пазіцыі.

- ✓ Жанравая своеасаблівасць.

Ці ўказвае аўтар жанр твора (назва, падзагаловак, тэкст)? Калі не – рысы якіх жанраў знайшлі адлюстраванне ў вершы?

Своеасаблівасць паэтычнай формы (строфіка, рытмічная арганізацыя, вершаваны памер, рыфма).

Колькі радкоў? Як пабудаваны верш? Ці падзяляецца на строфы? Колькі строф? Велічыня страфы (двухрадкоўе, чатырохрадкоўе, шасціраадкоўе і г.д.). Як звязаны паміж сабой (самастойныя ці ўзаемазвязаны)? Кампазіцыя строф: адначчасткавая (непадзельнае цэлае), двухчасткавая, куплетная і г.д.

Як гучыць верш (памер, рытм, лагічныя і псіхалагічныя паўзы, даўжыня радкоў, наяўнасць ці адсутнасць рыфмы, словы, якія рыфмуюцца)?

Прыёмы і сродкі выяўленчай і вобразнай мовы.

Што можна сказаць аб іх выбары і спалучэнні?

А) Асаблівасці паэтычнай мовы (лексіка).

Асаблівасці словаўжывання. Ужыванне слоў адной семантычнай групы. Ужыванне пэўных часцін мовы. Словы якой часціны мовы пераважаюць?

Стылістычна нейтральныя ці афарбаваныя словы (іх суадносіны).

Ці ёсць фразеалагізмы, сінонімы, антонімы (у тым ліку і кантэкстуальныя), амонімы?

Полісемія, мастацкія тропы (эпітэт, метафара, метанімія, сінекдаха, гіпербала, параўнанне, сімвал і інш.).

Б) Асаблівасці сінтаксісу.

Колькі сказаў? Якая структура сказаў? Выкарыстанне сказаў пэўных канструкцый.

Стылістычныя прыёмы (паўтор, антытэза, інверсія, паралелізм, рытарычнае пытанне, зварот, вокліч).

Гукавая інструментоўка.

Мілагучнасць, алітэрацыя, асананс, гукавыя паўторы, гукаперайманні і інш.

5. Асабістае ўражанне ад твора.

Якія думкі і пачуцці аўтар хацеў данесці да чытача? Што ў вершы сугучна сучаснасці? Асацыяцыі, якія выклікаюць вобразы, створаныя паэтам.

Шлях аналізу можа быць як ад зместу да формы, так і ў адваротным парадку. Аднак практыка паказвае, што найбольш плённым і цэласным з’яўляецца “чалночны” рух – пастаянныя пераходы ад ідэйна-мастацкага пласту праз кампазіцыю і вобразы да моўнага ўзроўню тэксту. Пры такім цыклічным характары аналізу ўсе высновы па змесце “правяраюцца” разглядам моўных сродкаў.

Маючы справу з лірычным творам, важна перш за ўсё асэнсаваць яго пафас, ухапіць вядучы эмацыянальны настрой.

**1.3. Формы напісання водгуку:**

1. Дзённік
2. Сон
3. Пісьмо

4. Заметка ў газету
5. Успамін
6. Ода
7. Слова нашчадкаў
8. Верш
9. Завочная экскурсія
10. Дыялог прадстаўнікоў розных пакаленняў, густаў ...
11. Выступленне перад уяўнай аўдыторыяй
12. Урок і г.д.

*Асноўныя патрабаванні да водгуку: абгрунтаванне і разважанне.*

**1.4.Тыповыя памылкі:**

1. Аднастайнасць (прымітыўныя) мовы.
2. Пераказ зместу твора.
3. Злоўжыванне цытатамі або іх неарганічнае ўвядзенне ў водгук.
4. Злоўжыванне элементамі літаратуразнаўчага і лінгвістычнага аналізу або іх прымітыўнае ўвядзенне ў водгук.
5. Адсутнасць жанравай цэласнасці.

Адна з памылак пры напісанні водгуку – падмена прадмета выказвання. Замест даследавання і ацэнкі мастацкага твора з уласцівымі яму эстэтычнымі заканамернасцямі пішучы спяшаецца вынесці “прысуд” самой рэчаіснасці. Варта памятаць, што мастацкі твор уяўляе сабой складанае адзінства аб’ектыўнага адлюстравання і суб’ектыўнага выражэння. Нават пры максімальнай апоры на фактычны матэрыял у творы захоўваецца вялікая доля вымыслу. Творчая апрацоўка рэчаіснасці праяўляецца ў самім адборы адлюстраваных у творы з’яў,ва ўсталяванні паміж імі сувязяў, у наданні жыццёваму матэрыялу мастацкай мэтазгоднасці. Такім чынам, мастацкі твор уяўляе сабой паказ рэчаіснасці і аўтарскае яе разуменне. Адлюстроўваючы тыя ці іншыя жыццёвыя з’явы, аўтар пэўным чынам іх ацэньвае. Кожны твор нясе ў сабе пэўную сістэму каштоўнасцяў і імкнецца яе сцвердзіць у свядомасці

чытача. Пэўны тып эмацыянальна-каштоўнаснай накіраванасці твора называецца пафасам.

Стваральнікам літаратурнага твора з'яўляецца яго аўтар. У літаратуразнаўстве гэта слова ўжываецца ў некалькіх значэннях. У першую чаргу, неабходна правесці мяжу паміж аўтарам рэальна-бтяграфічным і аўтарам як катэгорыяй літаратуразнаўчага аналізу. У другім значэнні пад аўтарам разумеецца носьбіт ідэйнай канцэпцыі мастацкага твора. Ён звязаны з аўтарам рэальным, але не тоесны яму, паколькі ў мастацкім творы ўвасоблена не ўся паўната асобы аўтара, а толькі некаторыя яе грані (хоць часта і важнейшыя). Аўтар мастацкага твора па ўражанні на чытача можа значна адрозніваццa ад аўтара рэальнага.

Пры разглядзе катэгорыі аўтара ў літаратуразнаўчым аналізе мы абстрагуемся ад біяграфіі рэальнага аўтара і разглядаем асобу аўтара, яе праяўленне ў канкрэтным творы, аналізуем аўтарскую канцэпцыю свету, яго светапогляд. Варта таксама памятаць, што аўтара не трэба блытаць з апавядальнікам у эпічным творы і лірычны героем у паэзіі.

Звычайна ў лірычным творы гаворка ідзе ад першай асобы ў форме "я" або "мы". У адрозненне ад паўсядзённага ўжывання "я" (рэальны чалавек) або "мы" (сукупнасць пэўных асоб), у лірыцы гэта мастацкія вобразы, яны нясуць у сабе абагульнены сэнс. "Мы" ў лірыцы – гэта вобраз асяроддзя, сукупнасць многіх людзей (блізкіх, сяброў, пакалення, сучаснікаў, народа, краіны, чалавецтва).

Такім чынам, пачынаючы аналіз тэксту, варта ўявіць рэальную біяграфію аўтара, каб разумець суадносіны адлюстраваных біяграфічных фактаў (таго, што насамрэч адбылося з аўтарам) і мастацкага вымыслу. Чым больш абстрактны змест твора, тым менш мэтазгодны зварот да біяграфіі аўтара. Фактам біяграфіі аўтара варта ўдзяліць увагу абавязкова, калі яны "праглядаюцца" ў тэксце твора.

Індывідуальнасць успрымання і трактоўка мастацкага тэксту – адзін з параметраў ацэнкі сачынення-водгуку. Жывы, непасрэдны чытацкі водзыў – толькі плюс рабоце. І, наадварот, аналіз тэксту, які не ўлічвае суб'ектыўнага

ўспрымання, рызыкуе стаць фармальнасцю. Пагэтаму так важны для далейшага аналізу тэксу эмоцыі, якія чытач атрымлівае падчас першага прачытання.

Неабходнай перадумовай аналізу становіцца “ўваходжанне”, “пагружэнне” ў тэкст і “прыняцце” чытачом мастацкага свету твора ў свой унутраны свет. Нашы пачуцці і думкі і ёсць тыя “вымяральныя прыборы”, якія вызначаюць накал пафасу і напружанне канфлікту, ацэньваюць думкі і мастацкія вартасці твора. Аднак гэта не азначае, што ў водгуку дастаткова будзе зафіксаваць суб’ектыўныя ўражанні і абмежавацца разважаннямі аб актуальным і цікавым для асобы таго, хто піша сачыненне. Безумоўна, інтэрпрэтацыя неабходна, але яна не павінна выцясняць аналіз твора.

Патрэбна зафіксаваць зведаныя эмоцыі і зразумець, чым выклікана менавіта такая рэакцыя. Але яшчэ больш важна высветліць, ці верныя зведаныя пачуцці і выкліканыя творам думкі, ці адпавядаюць яны самому твору. Неабходна ўважлівая праверка: ці з’яўляюцца першасныя ўражанні і ўяўленні больш ці менш дакладным адлюстраваннем твора ці гэта толькі выражэнне нашага асабістага ўнутранага свету наконт твора і ў сувязі з ім? Праверка і пераправерка суб’ектыўных чытацкіх ўяўленняў у выніку ўдумлівага перачытвання твора – вось адзіны шлях да аб’ектыўнага спасціжэння сэнсу твора.

# ГЛАВА 2. Методыка напісання водгуку на мастацкі твор

## 2.1. Метадычная схема да напісання водгуку:

- прапанова прыкладных варыянтаў (схем);
- узор водгуку на іншыя вядомыя вучням творы (іх аналіз на аснове прыкладных варыянтаў-схем);
- чытанне твора для водгуку;
- аналіз твора на аснове вядомых тэарытычных паняццяў з вызначэннем дамінантаў і іх ролі ў водгуку;
- выбар неабходных варыянтаў з прапанаваных і насычэнне іх кожным вучнем уласнымі ўражаннямі, меркаваннямі, ацэнкамі (лепш гэта зрабіць дома);
- зачытванне на наступным уроку атрыманых варыянтаў без уступу і заключэння;
- работа над уступам і заключэннем з прапанаваных варыянтаў;
- напісанне водгуку, папярэдне вызначыўшы жанр, у якім будзе пісацца водгук (лепш дома);
- аналіз водгуку пасля праверкі настаўніка (зачытванне лепшых узораў);

*Зыходзячы з тэорыі тэксту,*
*прааналізаваць літаратурна-мастацкі твор – значыць адказаць*
*на тры пытанні:*

- Аб чым і што гаворыцца ў дадзеным тэксце?
- Якім чынам, з дапамогай якіх сродкаў і прыёмаў раскрываецца падзея, думка, эмоцыя?
- Навошта, з якой мэтай раскрываецца?

## 2.2. Сродкі перадачы экспрэсіі:

- насычанасць твора знакамі прыпынку – перанос, акцэнтаванне ўвагі паўзай;
- бяззлучнікавасць – павялічвае тэмп;
- простыя сказы – перадаюць дынамізм думкі;
- кальцо, паўтор – акцэнтаванне ўвагі на паўтараемай з’яве;
- інверсія – экспрэсіўна-эмацыянальнае вылучэнне члена сказа;

- антытэза – сэнсавая кантраснасць цягне за сабой кантраснасць пачуццёвую;
- градацыя – нарастанне з’явы ўзмацняе сэнсавую экспрэсіўнасць;
- трагічнасць – узмацняе эмацыянальную сэнсавасць;
- канцэнтрацыя дзеясловаў – перадае дынамізм дзеяння (зрэдку дынамізм можа перадаваць і канцэнтрацыя адных назоўнікаў);
- фразеалагізмы – адлюстроўваюць каларыт мовы, часта адыгрываюць стылістычную ролю;
- размоўная лексіка – для эмацыянальнасці;
- неалагізмы – нясуць новыя адценні думкі;
- антонімы ў ролі сінонімаў і наадварот;
- гукаперайманне – спрыяе стварэнню гукавога і зрокавага вобразу;
- сімвал – тэкст сэнсава і пачуццёва насычаны;
- эпітэт – лаканічна і вобразна характарызуе з’яву, дае ацэнку;
- параўнанне – перадае своеасаблівасць бачання аўтара, яго пазіцыю, адносіны;
- гіпербала – выяўляе эмацыянальныя адносіны аўтара;
- метафара – вобразна выяўляе сутнасць з’явы.

Чапляйся за слова, унікай у яго сэнс і сімвалічнае значэнне. Пастарайся растлумачыць, чаму , на твой погляд, аўтар выкарыстаў іменна гэта слова, а не іншае. Кожнае слова ў тэксце мае сваё значэнне, яно не з’яўляецца выпадковым.

**2.3. Як пісаць водгук (паслядоўнасць)**

1. Некалькі разоў прачытай прапанаваны твор.
2. Паспрабуй зразумець, якія пачуцці ўзніклі ў цябе, калі ты чытаў тэкст. Пачні водгук са сваіх эмацыянальных уражанняў.
3. Можна пачаць водгук з паведамлення пра асацыяцыі, якія ўзнікалі ў цябе, калі ты чытаў тэкст, успамінаў, асабістага вопыту.

4. Можна пачаць водгук з прыказкі ці прымаўкі, прытчы, якую ты ўспомніў, і іх змест звязаны непасрэдна з асноўнай думкай твора. ***Памятай: пачатак павінен быць цікавым і арыгінальным.***

5. Улічвай, што словы водзыў і водгук роднасныя, таму той водгук на прачытаны твор, які ўзнік у цябе, і ёсць аснова водгуку.

6. Вызначы тэму тэксту і пастарайся яе дакладна сфармуляваць, расказаць пра яе.

7. Вызначы, як гэта тэма вырашаецца аўтарам праз кампазіцыю тэксту, яго тып (апавяданне, апісанне ці разважанне).

***Памятай: не захапляйся пераказам тэксту – усё роўна ён будзе горшым за аўтарскі.***

***8.*** Вызначы галоўную думку тэксту. ***Памятай, што яна значна шырэйшая за сам змест, мае абагульненні, гаворыць пра жыццёвую пазіцыю аўтара.***

9. Адкажы на пытанні: а якім ты бачыш аўтара ў творы? Ці падзяляеш ты яго пункт гледжання?

10. Тэкст – гэта жывы арганізм, ён дыхае, жыве. Пакажы, якія словы, словазлучэнні не толькі ствараюць мастацкую карціну, але і ўплываюць на твой стан, пачуцці.

11. Звярні ўвагу на назву твора, пракаменціруй яе. Калі назвы няма, паразважай, чаму аўтар не назваў свой твор.

12. Калі ты ведаеш што-небудзь пра аўтара тэксту, то цікава падай гэтыя звесткі.

13. Пракаменціруй дату напісання твора.

14. Калі ты чытаў у іншых аўтараў творы па дадзенай тэме, абавязкова напішы пра свой чытацкі вопыт.

15. Калі ў тэксце ёсць героі, ацані іх паводзіны, характары, параўнай з сабой, з вядомымі выпадкамі ў гісторыі ці літаратуры.

16. Пішы так, каб чытачы адчулі тваю зацікаўленасць.

17. Самае цікавае ў водгуку – паказаць, якімі сродкамі аўтар раскрывае тэму. Знайдзі цікавыя параўнанні, метафары, увасабленні, гаваркія прозвішчы, растлумач іх значэнне – гэта вельмі важна.

18. Ацані мову герояў.

19. Пракаменціруй гукапіс, пашукай словы, якія ствараюць мелодыю. Які сэнс гучання гэтай мелодыі?

20. Пашукай словы, якія надаюць тэксту колер. Яго значэнне?

21. Якімі сказамі карыстаецца аўтар? Чаму?

22. У тэксце можна выкарыстаць свае вершы або вершы іншых пісьменнікаў.

23. Падумай, як закончыць водгук, каб адчувалася цэласнасць вашага водгуку. Можна звярнуцца да пачатку работы.

24. Пішы жвава, пранікнёна, даверліва і без памылак!

Вынікае,што мэта водгуку на мастацкі твор – яго вытлумачэнне і ацэнка на аснове аналізу.

### 2.4. Прыкладныя варыянты элементаў структурна-кампазіцыйных частак водгуку на паэтычны твор

***Уступ*:**

- ураженні (асацыяцыі, успаміны, думкі, пачуцці, выкліканыя творам або яго асобнымі радкамі);
- першыя найбольш уразіўшыя радкі твора;
- уласнае ўспрыняцце асобы аўтара пры першасным яго прачытанні;
- аўтар твора як цікавая асоба.

***Асноўная частка:***

- наколькі цікавая тэма твора;
- ідэя твора;
- сэнс назвы, яе сувязь з тэмай і ідэяй;
- найбольш уразіўшыя вобразы;
- найбольш уразіўшыя думкі, сугучныя ўласным;
- пачуцці, якія знайшлі водгук у душы.

***Элементы літаратуразнаўчага і лінгвістычнага аналізу***:

- асаблівасці кампазіцыі твора;
- найбольш яркія выяўленча-вобразныя і моўныя сродкі выразнасці, іх роля ў тэксце.

***Заключэнне:***

- філасофскі змест твора;
- уласны пункт гледжання на вырашэнне ўзнятай у творы праблемы.

**2.5. Клішэ для ўвядзення літаратуразнаўчых тэрмінаў і лінгвістычных паняццяў**

- стварае, дае ўяўленне (уражанне) аб...
- сведчыць аб...
- перадае (што)...
- адлюстроўвае ці асвятляе (што)...
- выяўляе (што)...
- дае магчымасць зразумець...
- дазваляе адчуць...
- раскрывае ці ўвасабляе...
- прымушае задумацца...
- гаворыць аб...
- забяспечвае разуменне, увасабленне ці ўспрыманне...
- узнікае разуменне ці адчуванне...
- уражанне (якое)...
- характарызуе (што)...
- садзейнічае...
- уцягвае ў ...
- спрыяе перадачы...
- акцэнтуе ўвагу (на чым)...
- у (чым) заключана...
- аказвае ўздзеянне на..., якое служыць для...

- вызначае ці ўжывае...
- прыцягвае ўвагу...
- заслугоўвае ўвагі...
- дасягае...
- прыходзіць адчуванне...
- змог адшукаць ці перадаць, вызначыць ці знайсці...
- валодае майстэрствам у паказе...
- дае ўяўленне аб...
- з’яўляецца ўвасабленнем аўтарскага ідэалу...
- з’яўляецца адчуваннем...
- удалося стварыць...
- выяўляецца (што і як)...
- у...(чым) заключана (што)...
- з’яўляецца асновай (чаго)...
- (што)...сугучна (чаму)...
- дасягаецца...
- (чаму)...уласціва (што)...
- (што)...выпісана (як)...
- успрымаецца...(як)...
- мэтазгодна акрэсліць (што)...
- прыводзіць да разумення...
- (для чаго) выкарыстана...
- удаецца стварыць...
- паказаў магчымасці...
- (што) знаходзіць выяўленне ў...
- чытачу адкрываецца…

**Заключэнне**

***Рэкамендацыі настаўнікам, якія будуць рыхтаваць вучняў да напісання водгуку на алімпіядзе па беларускай мове і літаратуры***

1. Заўсёды неабходна памятаць, што ўступная і заключная частка водгуку павінны быць самымі яркімі, бо яны запамінаюцца больш, чым асноўная частка. Таму, па магчымасці, іх неабходна зрабіць арыгінальнымі. Хаця гэта неабавязкова. Водгук можа быць напісаны і ў традыцыйнай форме, але ўступ і заключэнне павінны быць адным цэлым.

2. Водгук павінен быць даволі аб'ёмным (на 4-6 старонак). Асабліва ў выпускным класе вучань павінен паказаць, што свабодна валодае мовай і ўмее сваю думку выказаць разгорнута.

3. Мова водгуку павінна быць насычана ўласнымі мастацкімі сродкамі. Рэкамендуецца, акрамя цытат, выкарыстоўваць фразеалагізмы, прыказкі, прымаўкі.

4. Пры выкарыстанні цытат неабходна памятаць, што яны павінны пераклікацца з самім творам вельмі цесна, арганічна ўплятацца ў водгук. Цытаты выкарыстоўваюцца не для таго, каб паказаць, што ты іх ведаеш шмат, а для таго, каб паказаць сваё ўменне выкарыстоўваць словы вядомых людзей у пацверджанне сваёй думкі. Цытаваць неабходна людзей, блізкіх да літаратуры, гісторыі, філасофіі, а не выказванні прадстаўнікоў шоу-бізнеса і г.д.

5. Абавязкова паказаць, што ты чытаў творы беларускай літаратуры па дадзенай тэме. Гэта твой чытацкі вопыт і вельмі добра, калі ён багаты. Можна прыводзіць для прыкладу творы рускай, замежнай і беларускай літаратур. Гэта толькі плюс да работы.

6. У якасці прыкладу, калі гэта да месца, можна прывесці і выпадак са свайго жыццёвага вопыту. Толькі гэта не павінна выглядаць недарэчным.

7. У водгуку не павінны сустракацца словы-паразіты або моўныя штампы. Гэта стварае адчуванне, што вучань недастаткова добра валодае мовай.

**Дадатак №1**

Тэма. МАСТАЦКІЯ СРОДКІ Ў ЛІТАРАТУРНЫХ ТВОРАХ

Мэты: спрыяць азнаямленню вучняў з відамі мастацкіх сродкаў; працаваць над фарміраваннем умення вызначаць іх у вершах; садзейнічаць засяроджанню ўвагі на ролі кожнага з іх; працаваць над развіццём маўлення вучняў.

Ход заняткаў

*1.Паўтарэнне вывучанага*

Якія мастацкія сродкі вы ведаеце?

Што такое эпітэт, метафара, параўнанне, адухаўленне?

Метафара – выкарыстанне слова ў пераносным значэнні ў выніку ўвасаблення: льецца музыка; расчасалі вішні косы.

Эпітэт – мастацкае азначэнне – цёплая сустрэча, ласкавае сонца.

Прывядзіце прыклады мастацкіх сродкаў, вядомых вам.

*2. Новая тэма*

- ❖ Вучні працуюць са “Слоўнікам літаратуразнаўчых тэрмінаў” М.А.Лазарук,А.Я.Ленсу, каменціруюць асноўныя літаратуразнаўчыя паняцці разам з настаўнікам. Новыя для сябе паняцці вучні запісваюць у сшытак.

•Аксюмаран – аб’яднанне процілеглых сэнсам паняццяў, якія ў спалучэнні даюць новае ўяўленне: жывы труп, горкая радасць, гарачы снег.

•Алітэрацыя – паўтарэнне аднолькавых зычных гукаў або спалучэння гукаў для ўзмацнення выразнасці: над зарослай асіннікам лесасекай сонна плыло сівое павуцінне (гук С).

•Анафара – паўтарэнне слоў, выразаў у пачатку радкоў: я не для вас, паны, о не! (Я.Купала)

•Эпіфара – паўтарэнне слоў, выразаў у канцы радкоў: эх, гора маё! (Ф. Багушэвіч)

•Антытэза – супастаўленне супрацьлеглых паняццяў, думак, вобразаў (часта з дапамогай антонімаў): лета збірае, зіма паядае; усходзілі, заходзілі свяцілы.

•Афарызм – кароткае, дасціпнае, арыгінальнае выказванне, якое мае закончаны змест і дасканалую форму: раны гояцца часам, а дружбаю – гора (А.Куляшоў); людзьмі звацца (Я.Купала); асадзі назад (Я.Колас); слоў не крышыць ні век, ні тапор (Я.Колас).

•Перыфраза – стылістычны прыём, калі замест агульнаўжывальнага слова называецца вобразнае спалучэнне слоў: лён – беларускі шоўк; Я.Колас – бацька беларускай прозы, бульба – другі хлеб.

•Імператыў – загадны лад дзеяслова(квітней, Беларусь; спявайце, горны)

- Інверсія – размяшчэнне членаў сказа у адваротным парадку з мэтай узмацніць выказванне (рэчка мутная; і звініць, і грыміць срэбразвонны ручэй)

•Літота – вобразны выраз з непамерным памяншэннем: з камарыны нос, як макавае зерне.

•Гіпербала – вобразны выраз з непамерным павелічэннем:

•Метанімія – перанос назвы аднаго прадмета ці з'явы на іншыя на аснове сумежнасці, унутранай сувязі паміж імі: гімнасты заваявалі золата (медалі), сабралася ўся школа (вучні); чытаць Мележа (творы), выпіў шклянку (малако).

•Сінекдаха – від тропа, заснаваны на колькасных адносінах паміж прадметамі: на жаль, гарлахвацкія ёсць і ў наш час; вораг нарэшце здаўся і адступіў (ворагі); прывітанне моладзі (маладому чалавеку)

•Паралелізм – аднолькавая сінтаксічная пабудова суседніх сказаў або іх частак: хай заўжды будзе сонца, хай заўжды будзе мір!

•Парцэляцыя – чляненне сказа, калі змест выказвання рэалізуецца не ў адной, а ў 2 ці больш сінтаксічных канструкцыях, размешчаных

адна за адной з працяглымі паўзамі: А пшаніца якая навокал! Густая, чыстая, высокая.

•Суплетывізм (суплетыўныя асновы) – утварэнне формы слова пры дапамозе розных каранёў(добры – лепшы, малы – меншы, мы – нас, хто – каго)

*3. Замацаванне*

Пазнайце, які мастацкі сродак перад вамі.

- Звонкая цішыня, горкі мёд (аксюмаран);
- Рабіна – восені рыбіна чырвонапёрая – трапеча ў імглістай стыні (алітэрацыя, гук Р);
- Ён кепскі, а я яшчэ горшы (суплетывізм);
- А скрыпка спявае! Сардэчна і сумна. (парцэляцыя і метафара);

гасцей сустракаў Мінск (метанімія);

- Не дрэва, а з лісточкамі, не поле, а засеяна (паралелізм);

чарніцы былі як вішні (гіпербала);

надвор'е яснае, цёплае (інверсія);

- Заспявай ты мне песню такую (інверсія, імператыў);
- Хваробы лечаць і атрутамі (М.Багдановіч) (афарызм);
- нафта – чорнае золата (перыфраза);
- Мой родны кут, як ты мне мілы (Я.Колас) (афарызм);
- Ліпкі ліпкія лісточкі (алітэрацыя, гук Л');
- Тут побач з боцікам блішчастым

Цяжкі салдацкі чаравік.

Тут учарашняе з сучасным

Тут боль з уцехаю ўпрытык. (анафара ТУТ, антытэзы УЧАРАШНЯЕ З СУЧАСНЫМ, БОЛЬ З УЦЕХАЮ).

*4. Падвядзенне вынікаў. Вучні ацэньваюць сваю работу на занятках.*

**Дадатак №2**

*Тэма. АФАРЫЗМЫ*

Мэты: садзейнічаць азнаямленню вучняў з паняццем афарызм, узнаўленню ў памяці вядомых афарызмаў; стварыць умовы для азнаямлення з новымі афарызмамі; спрыяць развіццю маўлення вучняў, умення выкарыстоўваць афарызмы ў сваіх выказваннях.

Ход заняткаў

I. Аб’яўленне тэмы, мэты заняткаў

II. Гучыць вуснае выказванне вучня на тэму “Мая родная мова”

II. Новая тэма

Афарызм (грэч.- выслоўе, вызначэнне) – кароткае, дасціпнае, арыгінальнае выслоўе, якое мае закончаны змест і дасканалую форму. Напрыклад: на прасторах жыцця, асадзі назад (Я.Колас); людзьмі звацца (Я.Купала)

Афарыстычнасць – насычанасць мовы, маўлення афарызмамі (афарыстычнасць выказвання).

IV. Замацаванне

- Вучні запісваюць афарызмы, аналізуюць іх сэнс.

Міколак Гусоўскі

1. Край наш – дзівосны прыстанак загадак і цудаў.

Леў Сапега

1. Чалавеку пачціваму нічога не мае быць даражэйшага за вольнасць.

Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч

1. Не таго патрэбна славіць, хто на лёдзе замкі ставіць.

Кастусь Каліноўскі

1. Няма чаго ждаці ад нікога, бо той жне, хто сее.

Францішак Багушэвіч

1. Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога дадзена.
2. Не пакідайце ж мовы беларускай, каб не ўмёрлі.

3. Той люд жыве, хто свае песні пяе.

Цётка (Алаіза Сцяпанаўна Пашкевіч)

1. Стану песняй у народзе.
2. Бедны той, хто, апрача грошай, апрача багацця, не мае скарбаў вечных – скарбаў душы.

Янка Купала(Іван Дамінікавіч Луцэвіч)

1. Не скуеш толькі дум ланцугамі.
2. Завецца спадчына мая ўсяго старонкай роднаю.
3. Не шукай ты шчасця, долі на чужым, далёкім полі.

Якуб Колас(Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч)

1. Добра быць у дарозе, якую ты сам выбіраеш.
2. І зямля свой твар мяняе.
3. Мой родны кут, як ты мне мілы...

Максім Адамавіч Багдановіч

1. Жывеш не вечна, чалавек, - перажыві ж у момант век!
2. Жыві і цэльнасці шукай,
Аб шыраце духоўнай дбай.
3. Хваробы лечаць і атрутамі.
4. І тчэ, забыўшыся, рука,
Заміж персідскага ўзора,
Цвяток радзімы васілька.

Кандрат Кандратавіч Крапіва

1. Малому веліччу быць хочацца заўсёды.
2. Разумных бараноў наогул жа нямнога.
3. Каб сонца засланіць – вушэй асліных мала.
4. Да славы прагныя, ды вузкія ў плячах.
5. Лес не сякуць языкамі.

Кузьма Чорны(Мікалай Карлавіч Раманоўскі)

1. Кожны чалавек – гэта цэлы свет.
2. Дзе прайшло маленства, там пачынаецца Радзіма.

3. І ў шчасці, і ў радасці без дружбы чалавеку нельга быць.

Пятрусь Броўка

1. Калі сумленны прад другімі, тады сумленны прад сабой.

Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў

1. Раны гояцца часам, а дружбаю – гора.

2. Спакойнага шчасця не зычу нікому.

Пімен Панчанка

1. Без чалавечнасці не будзе вечнасці.

2. Песню сваю, мову сваю я да грудзей прытульваю.

3. Лечыцца трава ад спёкі ліўнем, людзі ласкай лечацца людской.

4. І ўсё мілагучна для слыху майго: і звонкае “дзе”, і густое “чаго”.

5. Ад праўды раз адкруцішся - няпраўдаю атруцішся.

Янка (Іван Антонавіч) Брыль

1. Зусім не хістаюцца слупы, асабліва – глыбока ўкапаныя.

2. Выжываць трэба любой цаной, а жыць – усё-такі сумленна.

Іван Пятровіч Шамякін

1. Не ржавее і не паддаецца пазалоце толькі адно пачуццё: Любоў да зямлі, якую ты Радзімаю называеш, да народа, якому служыш, і да дзяцей, якіх нарадзіў.

Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч

1. Нельга есці хлеб народа і грэбаваць яго мовай.

2. Але вечна тваім застанецца толькі тое, што ты аддаў.

Сяргей Грахоўскі

1. Самы светлы талент – дабрата.

Анатоль Вярцінскі

1. Жыццё даецца, каб жыццё тварыць, не марнаваць, не нішчыць, не бурыць, -

Тварыць!

Анатоль Вялюгін

1. Беларусь – мая маці і мова, паветра і хлеб

Яўгенія Янішчыцц

1. Пачынаецца ўсё з любві, нават самая простая ява.

Сяргей Грахоўскі

Чалавеку патрэбна не слава, а людская ўвага і ласка.

Ніл Гілевіч

1. Край мой беларускі, край, дай мне прыгарнуцца дай, да твайго ляснога, вераснога долу, дзе так шчасця многа выпала на долю, дай.

V. Замацаванне. Стварэнне ўласнага вуснага выказвання з выкарыстаннем прапанаваных афарызмаў (тэма на выбар вучня).

VI. Узаемаацэньванне вусных выказванняў з улікам патрабаванняў да іх.

**Дадатак №3**

## Пімен Панчанка “Жаданні”

Хутчэй бы прыйшла зіма,
Белая і маладая,
З малінавымі маразамі,
Са звонам канькоў на лёдзе
І навагодняй ёлкай, -
Людзі штогод жадаюць.
Хутчэй бы прыйшла вясна
З сонечнымі вадаспадамі,
З блакітнымі навальніцамі,
З шалёным пахам чаромхі
І салаўіным каханнем, -
Людзі штогод жадаюць.
Хутчэй бы настала лета
З бурштынна-густой пшаніцай,
З яблыкамі наліўнымі,
З крымскім вясёлым загарам,
З радасцю школьных вакацый, -
Людзі штогод жадаюць.
А каб восень хутчэй прыйшла
З безнадзейнасцю цёмных дажджоў,
З граззю, з апалым лісцем,
З няспраўджанымі спадзяваннямі
І горкімі ўспамінамі, -
Гэткіх не чуў я жаданняў.
Восень можна лёгка пераажыць:
Вернецца вясна.
А вось юнацтва...
Ах, як трэба маем даражыць, -
Здолеў я з тугой пераканацц.

## Водгук на верш Пімена Панчанкі “Жаданні”

Я цябе заклінаю – будзь гаючым дыханнем вясны,
У дні белага-белага мая ты прыйдзі ў мае сны...

*Іван Лашутка*

Вішанька, якую мы пасадзілі каля хаты колькі гадоў назад, ужо рослае дрэва. Штолета дае шчодры ўраджай. Старэе...А памятаю, як цудоўна яшчэ слабенькае дрэўца зацвіло ў першы раз! Упершыню кволыя галінкі асыпала бела-ружовымі кветачкамі, ад якіх быццам павявала вясенняй чысцінёй, свежасцю, непаўторнасцю... То была першая сапраўдная вясна для вішні. Такой больш не будзе...

Час, нібы рака, імкліва цячэ. Незваротна. І мы, безумоўна, трапляем у так званы жыццёвы вір, які часам моцна ўцягвае, паглынае нас, адбіраючы

магчымасць адчуваць, перажываць самыя важныя моманты жыцця. Нам толькі б хутчэй, хутчэй, хутчэй...

Так і пачынавецца кожны радок верша Пімена Панчанкі “Жаданні”. Людзі (па сабе ведаю) часта жадаюць прыспешваць час, набліжаць запаветныя імгненні жыцця. Так часта чалавек не заўважае, як незваротна мінаюць яго лепшыя гады. Ды, як сказаў Сяргей Грахоўскі ў творы “Дакор сабе”: “Не скажаш часу “Пачакай”. А так адчайна, нястрымна хочацца вярнуць сваё юнацтва.

Юнацтва, май, першае “кахаю”, ліпеньскае зорнае неба! Адчуванне таго, што стрэлка гадзінніка спынілася. Прыемная лёгкасць у нагах, якія вось-вось панясуць цябе туды, дзе кожны раз усё перажываецца па-новаму. Вясёлая песні ў сэрцы, бесклапотныя, але чыстыя, светлыя думкі. Ружовыя сны, ад якіх так цяжка прачынацца... Малады, ты пакуль не ўсведамляеш, што з’яўляешся Папялушкай на першым, апошнім, а таму адзіным балі юнацтва. А калі сталееш, то, як і аўтар верша “Жаданні”, разумееш, што “трэба маем даражыць”.

Пімен Панчанка, знаходзячыся ўжо на другім беразе жыццёвай ракі, мудра разважае, пераасэнсоўвае чалавечае быццё. Жыццё складаецца са стагоддзяў, стагоддзі – з гадоў, гады – з зімовых, вясновых, летніх і восеньскіх месяцаў. Поры года прыходзяць да нас, прыносячы з сабой падарункі: “малінавыя маразы”, “сонечныя вадаспады”, “наліўныя яблыкі”, а часам і “безнадзейнасць цёмных дажджоў”. Усё гэта для таго, каб мы маглі зразумець прызначэнне кожнай радаснай або горкай праявы, ацаніць яе. Не для бясконцага чакання і слова “хутчэй бы” дадзена жыццё, дадзена маладосць, дадзена шчасце, якое мы самі мінаем спяшаючыся.

Аўтар верша прымушае нас, пакуль што маладых, звярнуць увагу на гэта, выкарыстоўваючы шматлікія эпітэты: “блакітнымі навальніцамі”, “салаўіным каханнем”, “бурштынна-густой пшаніцай”, “вясёлым загарам”, “яблыкамі наліўнымі”. Кожны слупок пачынаецца з анафарычнага “хутчэй бы” і заканчваецца эпіфарычным выразам “людзі штогод жадаюць”, што мае адценне

аўтарскага асуджэння легкадумнасці людзей, іх мітуслівасці, праз якую яны лічаць сябе нешчаслівымі. Многія радкі пачынаюцца з прыназоўніка “з”, што дапамагае аўтару пералічыць ўсе прыемныя і непрыемныя з’явы жыцця, якімі часта патрэбна даражыць. Асаблівую ўвагу прыцягвае апошні слупок. Там адначасова сцвярджаецца тое, што “восень можна лёгка перажыць: вернецца вясна”, але і тое, што толькі юнацтва непаўторнае. Менавіта шматкроп’е пасля гэтага слова выражае асабістыя адносіны Пімена Панчанкі да мая: ён мінуў, а разам з ім тое, што калісьці перажывалася ўпершыню. А такое не забываецца ніколі.

Вялікае адрозненне паміж вясной года і вясной жыцця. Першая яшчэ не раз парадуе нас квеценню садоў, зялёнай траўкай, звонам раўчукоў і шчырым сонцам. А вясна жыцця... яна адна. Ад яе застаюцца толькі ўспаміны, якія кожны з нас, несумненна, пранясе праз гады.

**Дадатак №4**

Мне сніліся чамусьці Плехані – вялікае несхадзімае балота, якога я ніколі не бачыў, ніколі не быў там, але ведаў, што і з Табачнікаў, і з іншых навакольных вёсак хадзілі раней туды па журавіны.

Пра яго мне летась расказваў дзед Сцяпан:

- Раней там жураўлі выводзіліся. Плехані – жураўлінае балота. А сёлета нешта жураўлёў не відаць. Мусіць, і там вывеліся. А то ж у гэта ўрэмя чарада за чарадою праз Табачнікі ляцелі. Некаторыя нават за Гараваткаю начавалі. Крычалі там так, што і глухі пачуіць. Я сам хадзіў туды глядзець...Цяжкі ў іх пералёт. Кажуць, што за дарогу яны сабе пад крыллем такія буглакі панабіваюць, панатруць – па яблыку. А што ты думаеш, столькі махаць лёталамі. А ці чуў ты, як яны крычаць, калі, бывае, важак з дарогі саб’ецца? Кружаць тады ў небе доўга-доўга і ўсё трывожна, адчайна крычаць. Пакуль важак зноў на сваю, правільную, дарогу не ўзаб’ецца. А сёлета – ціха. Мусіць, і праўда не вывеліся. А можа, раней паляцелі. Але ж не – і раней было іх. А Плехані, кажуць, сапсавалі – канавы выкапалі і спусцілі некуды тое балота...

Дык вось мне снілася, што над Плеханямі, сярод журавоў, такі ж, як яны, роўны ім, кружу, як той важак, што збіўся з дарогі і ніяк не можа намацаць інтуіцыяй той адзіна правільны шлях, па якім трэба ляцець, трывожна кружу і крычу над колішнім балотам, а за мною роспачна крычаць і ўсе журавы. А я пад пахамі, там, дзе крылы, яшчэ не ляцеўшы, адчуваю тыя цвёрдыя, уздутыя буглакі, якія, знайшоўшы шлях, наб’ю за нялёгкую, доўгую дарогу...

Янка Сіпакоў “Птушкі”

### Водгук на празаічны твор Янкі Сіпакова "Птушкі"

І я вінаваты ў тым:
Без толку балотца асушана.
Напэўна, і ў слове маім
Трывога гучала прыглушана.

*Юрась Свірка*

Мяне з дзяцінства вабіла невялікае штучнае возера, якое знаходзіцца і цяпер метраў за сто ад майго дома. Улетку, калі неба яснае і сонца прыветліва-цёплае, у чароўным люстэрку адбіваўся цудоўны блакіт. Яго не маглі не заўважыць турысты і рыбакі. Узімку возера, трывала скаванае лёдам, так і клікала да сябе дзятву на каньках. А ранняй восенню там знаходзілі сабе прытулак белакрылыя лебедзі. Лебедзі... мае вечна любімыя птушкі. Маленькай дзяўчынкай, памятаю, карміла іх хлебам ледзь не з рук: птушкі, быццам прыручаныя, паслухмяна падплывалі ўсё бліжэй...Так было...Ды нібы хтосьці неразумны і пакрыўджаны на ўвесь свет загадаў выкінуць смецце на бераг возера. Хутка шырокае люстэрка значна павузела, вада ў ім закішэла рознымі паперкамі, бітым шклом, пластмасай. І ўсё радзей, радзей мільгацелі там лебядзіныя крылы, аж пакуль іх не стала відно зусім. Няўдзячныя людзі не змаглі ацаніць такой натуральнай, непаўторнай, чыстай прыгажосці, паспяшаліся знішчыць яе. А лебедзі так падабаліся дзецям!

Безумоўна, я не хачу сказаць, што ўсе такія бессардэчныя і няўдумлівыя дзікуны. Як кажуць, свет не без добрых людзей: не звяліся яшчэ і тыя, хто не абыякава ставіцца да захавання самабытнасці прыроды. Сярод іх і Я.Сіпакоў. Яго  твор "Птушкі" прымусіў мяне задумацца над актуальным пытаннем экалогіі. Часта мы кажам:"Які цудоўны свет!" Але дзесьці (не толькі ў Беларусі) знішчаюць рэдкіх жывёл, як гэта апісваецца ў вершы Станіслава Валодзькі "Забойства ласіхі". Дзесьці плачуць бабры, як гаворыцца ў творы Юрася Свіркі "Змялелай рэчцы".

У творы ж Янкі Сіпакова без роднага прытулку засталіся жураўлі: "несхадзімае балота" Плехані асушылі і "спусцілі некуды". Жураўлінае балота,

нават жураўлінае царства, апусцела. А як, пэўна, там было цудоўна да меліярацыі! Аўтар паведамляе, што ў Плехані "і з іншых навакольных вёсак хадзілі раней па журавіны". Пэўна ж, людзі не раз дзівіліся з прыгажосці, зграбнасці гэтых велічных птушак, цешыліся з маленькіх жураўлянят. Там ствараліся цэлыя сем'і. Уяўляю, як весела было б паназіраць за птушачкай, якую маці-жураўліха вучыць лётаць, якую ледзь-ледзь падымаюць у неба слабенькія крыльцы. Неўзабаве зусім непрыкметна яна ператварылася б у вялікага жураўля, які б разам з усімі выправіўся ў палёт. Дзед Сцяпан, які расказваў аўтару пра Плехані, адзначыў, што "цяжкі ў іх пералёт". Казаў, што "за дарогу яны сабе пад крыллем такія буглакі панабіваюць, панатруць – па яблыку". Шкада мне птушак! Знясіленыя нялёгкай дарогай, жураўлі спяшаюцца ў родны куточак, туды, дзе змогуць акрыяць, адпачыць. А таго куточка больш няма, як і няма надзейнага прыстанішча, сродкаў для таго, каб выжыць. Як для птушак, так і для нас, людзей, такое становішча згубнае.

Увогуле, твор Я.Сіпакова "Птушкі", асабліва маналог дзеда Сцяпана, уразілі мяне адначасовай простасцю і глыбінёй. Тут ярка перададзены пачуцці болю, страты і нават нейкай безвыходнасці пры дапамозе элементаў гутарковага стылю. Ён жа яшчэ і паказвае на тое, што непарыўна блізка суіснуе прырода і чалавек, асабліва чалавек-вясковец. Мова дзеда Сцяпана, звычайнага селяніна, напоўнена гутарковымі словамі "урэмя", "пачуіць", "буглакі", "лёталы". Сказы ў большасці простыя, ускладненыя пабочнымі словамі "мусіць", "кажуць", "бывае", "можа". Гэтыя словы падкрэсліваюць развsitulівасць і назіральнасць дзеда Сцяпана. Значыць, чалавека сапраўды хвалюе тое, што "сёлета – ціха" на балоце, што жураўлі "не вывеліся". І ўвогуле, увесь маналог Сцяпана – гэта цэлая антытэза, як і два словы ў ім: раней і сёлета.

Што да разважанняў самога аўтара, то мова яго больш алегарычная і не менш эмацыянальная. Янка Сіпакоў па-філасофску параўнаў сябе з важаком жураўлінай чарады, што крычыць над "колішнім балотам" і "ніяк не можа намацаць інтуіцыяй той адзіна правільны шлях". Словы "збіўся з дарогі",

“трывожна кружу, крычу”, “роспачна” перадаюць адчай і нявысветленасць выйсця. Куды ляцець далей? У які бок пракладаць свой новы шлях, каб журавы, што ляцяць ззаду, не крычалі роспачна?

Сучасны афарыст Марцін Коўзскі даводзіць да нас: “Эра кентаўраў скончылася, калі чалавек, нахвостваючы каня, зразумеў, што паганяе сам сябе”. Здаецца, гэта было так даўно, але чаму мы і сёння такія ж няўдумлівыя? Чаму не разумеем адной простай ісціны: прырода не майстэрня, а чалавек у ёй не гаспадар. Без лесу мы не дыхаем, без рэчак мы не п’ём. А значыць, не жывём.

## Спіс выкарыстаных крыніц

Куліковіч, У.І. Школьныя алімпіяды па беларускай мове. Мінск: Аверсэв, 2006.

Куліковіч, У. І. Алімпіяды па беларускай мове / У. І. Куліковіч. – Мінск: Аверсэв, 2007.

Лазарук, М.А., Ленсу, А.Я. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў. – Мн., Народная асвета, 1996. – 176 с.

Лаўрэль, Я. М. Водгук на паэтычны твор.// Роднае слова.-№10, 2003г.

Малажай, Г.М., Красней, В.П. Алімпіяды па беларускай мове: дапам. для навуч. агульнаадукац. шк., гімназій, ліцэяў/Г.М. Малажай, В.П.Красней.– 2-е выд., дапрац.– Мн.: ТДА "Аверсэв", 2001. -234 с.

Пучынская,Т. Водгук на мастацкі твор на ўроках літаратуры.// Роднае слова. - №7, 2011 г. - 67 с.